# Дзень адкрытых дзвярэй пройдзе ў БДУІР 5 студзеня

* 03.01.2023 14:50

**Абітурыентаў чакаюць у 11.00 у навучальным корпусе № 2 (вуліца Петруся Броўкі, 4).**

Падчас мерапрыемства абітурыенты змогуць задаць пытанне старшыні прыёмнай камісіі, рэктару ўніверсітэта Вадзіму Анатольевічу Богушу, намесніку старшыні прыёмнай камісіі, першаму прарэктару Максіму Віктаравічу Давыдаву і адказнаму сакратару прыёмнай камісіі Васілію Бандарыку.

З 11.00 да 14.00 у холе першага паверха пройдзе выстаўка-прэзентацыя факультэтаў. Іх прадстаўнікі адкажуць на ўсе пытанні абітурыентаў, раскажуць аб спецыяльнасцях, па якіх вядзецца падрыхтоўка, і арганізацыях, дзе працуюць выпускнікі ўніверсітэта.

Таксама будзе даступная анлайн-трансляцыя па спасылцы https://www.youtube.com/watch?v=FbIylms3B1I

**Надзея НІКАЛАЕВА**